Аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы

ДУК "САЛІГОРСКАЯ РАЁННАЯ ЦЭНТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА"



75 ГОД

З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ПІСЬМЕННІКА-ЗЕМЛЯКА

# ЗЯМЛЯ БАЦЬКОЎ - мая зямля

МЕТАДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ



## Пра мае вершы

*Не раз натхнення кнігаўка кружыла,*
*І ў полі, у лесе, у лузе ля ракі*
*Я помню й сёння кожную сцяжыну,*
*І летам, і зімой на паляванні*
*Нас з імі не разліць было вадой,*
*Метафары за мной і параўнанні,*
*Як камары, ляцелі чарадой.*
*Гайдалі рыфмы весела, як качка.*
*Вядома, гэта ж і па іх віне*
*Бо строфы ў локаць штурхалі мяне.*
*Было й такое, мушу вам прызнацца,*
*Калі на паляванні з двух ствалоў*
*Дуплеціў так бясслаўна я па зайцу,*
*Што потым доўга сорамна было.*
*Да вогнішча вяртаўся я не з першых,*
*Але аддана слухалі сябры*
*Мае яшчэ зусім сырыя вершы*
*Амаль да яснай ранішняй зары.*
*З іх кожным прысвечэннем я пазначыў,*
*І колькі б ні спалілі мы кастроў,*
*Я шчасце меў, бо ведаў адназначна,*
*Што многа значу для сваіх сяброў.*

## ГУРЫНОВІЧ ХВЕДАР ХВЕДАРАВІЧ



Нарадзіўся 14 верасня 1950 года ў в. Крывічы Салігорскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1967 годзе скончыў сярэднюю школу і паступіў у Салігорскі горнахімічны тэхнікум. У 1969 – 1971 гадах служыў у арміі. У гэты час у газеце «Балтийский луч», што выходзіла ў горадзе Ламаносаў Ленінградскай вобласці, выступіў са сваімі першымі вершамі, напісанымі па-руску. Пасля звальнення ў запас працаваў на будоўлі, у Старобінскім БМУ (1971-1972гг.), на Мінскім электратэхнічным заводзе (1972-1974гг.), на 2-м рудаўпраўленні горада Салігорска (1974-1978гг.), на Салігорскім рамонтна-механічным заводзе (1976-1981гг.), мастаком-афарміцелем. З 1983 года - карэспандэнт сельгасаддзела газеты «Шахцёр» (1981-1983гг.), быў дырэктарам Салігорскага краязнаўчага музея (1983-1986гг.). У 1975 годзе паступіў на завочнае адзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які скончыў у 1981 годзе. Як прапагандыст роднай мовы часта выступае на прадпрыемствах, у навучальных установах Салігорска. З'яўляецца членам гарадскога Таварыства

беларускай мовы, адказным сакратаром таварыства «Кніга», членам прэзідыума таварыства паляўнічых і рыбаловаў.

З 1986 года адказны сакратар шматтыражнай газеты «Калійшчык Салігорска».




Адзначаны Літаратурнай прэміяй імя Янкі Маўра. Узнагароджаны дыпломам Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Залаты купідон», двойчы ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі Саюза пісьменнікаў Беларусі і іншымі ўзнагародамі. Прысвоены званні «Ветэран працы», «Заслужаны ветэран працы». Званне «Ганаровы грамадзянін Салігорскага раёна» прысвоена ў 2016 годзе.

Друкуецца з 1969 года. Першая публікацыя ў беларускім друку з'явілася ў 1972 годзе у газеце «Знамя юности».

Першы вершаваны зборнікаў вершаў «Хлеб і соль» выдаў у 1980 годзе. Пазней з'явіліся «Шматгалосая кветка» (1983), «Дачыненне» (1991), «Вішня цвіце» (1992) , кніга вершаў для дзяцей «Пасадзім па дрэўцу» (1993), кніжка-загадка «Птушыная азбука» (1995) за якую атрымаў прэмію імя Янкі Маўра.

У 1995 годзе у выдавецтве «Мастацкая літаратура» выданы зборнікі «Што я ўнуку скажу?» і «Запрашаю пад дождж». У гэтай кнізе Х. Гурыновіч паглыбляе распачатую ў ранейшых зборніках тэму любві да Радзімы. Вершы яго прасякнуты клопатам аб зялёных сцяжынках маленства, болем за будучыню нашчадкаў.




*Я запрашаю вас пад дождж,*
*Пад дождж і сонечныя промні.*
*Ёсць у мяне білеты з бронню.*
*Вы не ў гумары сёння? – Ўсё ж*
*Я запрашаю вас пад дождж.*
*Я запрашаю вас пад дождж,*
*Дзе, як Кіжы, плывуць па плошчы*
*Дамы, і дожджык іх палошча –*
*Свавольны – ўпоперак і ўдоўж.*
*Я запрашаю вас пад дождж.*

З цікавасцю чытаецца арыгінальная паэма «Шлях да волі». Аўтар спадзяецца, што яго паэзія абудзіць у чалавеку дабрыню, шчырасць, спагаду.

У 1996 выйшаў зборнік «Пад знакам Дзіяны». Сюды ўвайшлі вершы пра паляванне, рыбалку, грыбы.

Паэзія лічыцца сапраўднай толькі тады, калі яна ўзрушвае чытача, западае ў душу, прымушае суперажываць аўтару, асэнсоўсоўваць прачытаннае. Паэзія Хведара Гурыновіча якраз валодае той сілай, што прымушае бачыць рэчаіснасць яго вачыма. Яго ёмістыя параўнанні, яркія метафары ствараюць запамінальны паэтычны вобраз у вершах: «Едзе гром, як на быках, едзе гром і круціць жорны, сыпле мліва па баках…» («Гром»), «Як звер падранены, зіма адчайна раніцай кусае» («Прадвесне»), «Маладзік між зорак, быццам ліс, з вечара абкладзены сцяжкамі» («Маладзік»), «Нацягвалася леска, як струна, і балерынай рыба танцавала… і шчупакі, як корцікі марскія…»

(«Рыбацкае»). Немагчыма пералічыць жамчужнага россыпу паэтычных знаходак Хведара Гурыновіча, бо яны сустракаюцца ў кожным вершы. У зборніку «Пад знакам Дзіяны» іх бясконцы шчодры россып.

Асобнае месца ў паэзіі Хведара Гурыновіча займае чарнобыльская тэма. Многія радкі вершаў прасякнуты болем за будучыню нашчадкаў, атручаную чарнобыльскім смерчам, і ўсё-такі разам з аўтарам давайце верыць у лепшы заўтрашні дзень, бо вера застаецца.

*Распятая трава*
*Рамонак з падарожнікам,*
*Паслён і дзівасіл-*
*Трагедыя заложнікі,*
*Ніхто вас не скасіў.*

*Не выйдуць дзеўкі зграбныя*
*Грабці пакосы тут,*
*Нібыта дом разграбляны,*
*Маўчыць палескі кут.*

*Насохным сенам, копамі*
*Не стрэне ён гасцей.*
*Зямлю ў зямлю закопвалі,*
*А лета зноў цвіце.*

*І горка пахне мятаю*
*Па ўзгорках, па ірвах,*
*Як на крыжы распятая*
*Палеская трава.*

Выйшла рускамоўная кніжка для дзяцей «Сто хрустальных родничков».

Да свайго пяцідзесяцігоддзя, як бы падводзячы вынікі творчасці, выходзіць зборнік «Пабыць аднаму» (2001). Думкі пра зробленае за гэты час не толькі ў паэзіі, а і ў штодзённым жыцці, пранізваюць многія вершы паэта. Нягледзячы на тое, што аўтар даволі аб’ёмную кнігу дзеліць на шэсць раздзелаў, у ёй прасочваюцца тры галоўныя напрамкі: грамадзянская лірыка, прырода і паляванне, працоўныя будні салігорскіх шахцёраў.

*Сення з сабой я цябе не вазьму.*
*Довады – некрасамоўныя:*
*Проста патрэбна пабыць аднаму,*
*Поўдзень жыцця падсумоўваючы.*
*Каля цяпельца душа растае,*
*Дражняць дразды-перасмеўнікі.*
*Быццам бы воблакі, думкі мае*
*Ціха плывуць, перасмешваюцца.*

Паэзія Х.Х. Гурыновіча прыцягвае свежасцю ўспрымання жыцця, нестандартнасцю мыслення і падыходу да раскрыцця тэмы. Яго вершы - пра хлебаробную і шахцёрскую Салігоршчыну, дзе аўтар жыве і працуе, родную прыроду. Гонар за працу сваіх землякоў , і прыгажосць прыроды, і боль за прычынены ёй урон –

усё жыве ў яго вершах арганічна і пранікнёна. Паэт піша для людзей пра ўсё, што нам дарага і неабходна ў гэтым жыцці.

Як адказны сакратар салігорскай газеты шмат увагі аддае выхаванню маладой творчай змены.

*Тут рамантыкі ніякай.*
*Засцяць позірк соль і пот.*
*Хоць ваяка ты з ваякаў,*
*Тут, па сутнасці, ты – крот.*
*А без солі й поту нельга,*
*Нельга тут не гнуць гарба.*
*Вочы свецяцца, бы ў негра,*
*З-пад мурзатага ілба.*

Голас Хведара Гурыновіча не губляецца ў хоры сучаснай беларускай паэзіі, а наадварот гучыць упэўнена. Хведар Гурыновіч у сваіх творах не паўтарае іншых. Гэта тычыцца і традыцыйных матываў: любові да прыроды, блізкага чалавека, адданасці Бацькаўшчыне. Тым больш арыгінальны Хведар Гурыновіч у вершах, у якіх звяртаецца да рэалій сённяшнега дня, расказвае пра жыццё і працу сваіх землякоў, не абыходзячы ўвагай і вострых праблем Салігоршчыны, звязанай з забруджваннем мясцовасці, выкліканай здабычай калійных угнаенняў.

Хведар Гурыновіч – заядлы паляўнічы. Любіць ён пастаяць на цязе вальдшнэпаў, пасядзець на цецеруковыі таку, папільнаваць на ячнішчы пралётных сцярожскіх гуменнікаў. Самы любімы від яго палявання – гэта скрадванне хітрай кумы-лісіцы ў неабсяжным зімовым полі. ХведарГурыновіч – паляўнічы не толькі заядлы, але і ўдачлівы, а таму рэдка вяртаецца з поля ці лесу без трафея.

Але галоўныя «трафеі» – вершы, якія аўтар піша ля паляўнічага вогнішча, у леснічоўцы альбо дзе-небудзь на лясной восеньскай паляне.

## Віктарына «Аб жыцці і творчасці Х. Гурыновіча»

1. Дзе і калі нарадзіўся Х. Гурыновіч? *(у вёсцы Крывічы Салігорскага раёна 14.09.1950г.)*.

2. У якім годзе паступіў Х. Гурыновіч на факультэт журналістыкі БДУ? *(у 1975 годзе)*.

3. У якім годзе і дзе пачаў друкаваць свае першыя вершы? *(у 1969 – 1971 гадах служыў у арміі. У гэты час у газеце «Балтийский луч», што выходзіла ў горадзе Ламаносаў Ленінградскай вобласці і выступіў са сваімі першымі вершамі, напісанымі па-руску)*.

4. У якім годзе і дзе з’явілася першая публікацыя ў беларускім друку? *(у 1972 годзе у газеце «Знамя юности»).*

5. За які дзіцячы зборнік Хведар Гурыновіч атрымаў прэмію імя Янкі Маўра? *(за кнігу «Птушыная азбука»).*

6. У якім годзе выйшаў першы вершаваны зборнік і як ён называўся?(*у1980 годзе. «Хлеб і соль»).*

7. Пад якой назвай у 1992 годзе выйшаў зборнік вершаў Х. Гурыновіча? *(«Вішня цвіце»).*

8. З якіх частак складаецца кніга лірыкі «Запрашаю пад дождж»?*(5 частак. «Запрашаю пад дождж», «Гармонія жыцця», «Палон ці воля», «Рэчка памірае», «Застаецца вера»).*

## Вершы Хведара Гурыновіча

**Фотоснимкі**

Громко, что картечь,
Град стучит в окно.
В нашем доме печь
Выстыла давно.
Древоточец – глянь –
Потолок долбит.
На окне герань,
Черная, стоит.
Рамы на стене –
Фотоснимки в ряд.
Шлют улыбки мне
Мать, отец и брат.
Бабушки, дядья…
Стыло на душе.
Не увижу я
Вас, родных, уже.
Улыбайтесь мне,
Хоть из-за стекла.
Хочется вдвойне
Вашего тепла.

**Русак**

Он выпорхнул буквально из-под ног,
Осыпав лыжи бархатной порошей…
И ахнул выстрел, хрупкий мир вспоровший;
И эхо нервно повторило: гр-рох!
И затаилось в призрачных лесах,

Где устоялась тишина стальная.
Следов в снегу почти не оставляя,
Катил межой седеющий русак.
Охотник гильзу теплую швырнул,
Как будто виноватую в промашке,
И весь намокший, словно промокашка,
Ушанку с потной лысины стянул.
Ругая, словно тяжкую болезнь,
Свою поспешность, свой характер пылкий,
Во внутренний карман стрелок полез,
Дрожащим пальцем зажигалкой чиркнул…

**Незабудки**

На осине листва сгорает,
И зима уж не за горами,
И засохло все, что цвело.
Незабудки во мгле болотной,
Незабудки в воде холодной,
А какое от них тепло!

Вечереет, и зябнут пальцы.
Незабудковый, может статься,
Соберу для тебя букет.
Да, наверно, они не в моде,
Зацвели вот не по погоде,
Но прекрасней букета нет…

**Тишина**

Месяц низко-низко, хоть руками
Трогай.
Вечер чистый – что слеза.
И такая тишина! – такая:
Слышно даже, как с травы стекает
Крупная хрустальная роса.

С каждым днем поля грустней и чище.
Значит, на подходе осень; все ж
Будь в согласье с возрастом, дружище,
То, что отоснилось, не тревожь.

Отцвело, отпело наше лето.
Хоть еще не близко до зимы,
С яблонь тихо падают ранеты.
Опадем однажды так и мы…

**Зимнее**

Под упругим каблуком
Снег – хрустящим яблоком.
Хорошо бродить вдвоем
По крещенским ярмаркам.

Солнце, снег… Твои глаза –
До чего ж красивые!
В них искрятся небеса,
Синие-пресиние!

Тени веток на снегу –
Ломаные линии.
Влажный блеск невинных губ –
Алою калиною.

Ох и щиплет же мороз! –
На тебе да вот тебе!
Зря старается: прогноз
Обещает оттепель.

И хоть застит взор тебе
Снежных елей готика,
Но заметней на вербе
Нетерпенье котиков.

**Любимой**

Грусть скопилась и не тает
На заснеженной аллее,
Но когда твой взгляд светает,
Солнце радостно светлеет.

Я тону в нем неизбежно,
В этом взгляде синеоком.
Как он искренен и нежен –
Взгляд очей твоих глубоких!

Стала ты моей судьбою,
Друг мой милый, друг мой вешний,
Я богат одной тобою,
Я одной тобой утешен.

Пусть ветра несчастий горьких
Пролетают мимо, мимо.
Ты – моя земная зорька,
Мать детей моих любимых.

Боль, неверье и тревогу
Снимешь ты в одно мгновенье.
Ты, любимая, от Бога,
Ты – от неба, несомненно.

Творы Хведара Гурыновіча:

1. Гуринович, Ф. Весна: поэмы / Федор Гуринович. – Минск: Книгосбор, 2012. – 135 с.

2. Гурыновіч, Хв. Вішня цвіце: вершы / Хведар Гурыновіч. – Мінск: Маст. літ., 1992. – 110с.

3. Гуринович, Ф. Год – как жизнь, жизнь – как год: поэма / Федор Гуринович. – Минск: Книгосбор, 2008 – 256 с.

4. Гурыновіч, Хв. Запрашаю пад дождж: кніга лірыкі / Хведар Гурыновіч. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 367 с.

5. Гурыновіч, Хв. Застаецца вера: выбранае / Хведар Гурыновіч. – Мінск: Літаратура і мастацтва, 2010. – 160 с. – (Лімаўскі фальварак).

6. Гурыновіч, Хв. Лёс на далоні: вершы, апавяданні / Хведар Гурыновіч. – Мінск: Юнацтва, 2001. – 141 с.

7. Гурыновіч, Хв. Пабыць аднаму..: кніга лірыкі / Хведар Гурыновіч. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. – 192 с.

8. Гурыновіч, Хв. Пад знакам Дзіяны: лірыка / Хведар Гурыновіч. – Мінск: Маст. літ., 1995. – 222 с.

9. Гурыновіч, Хв. Пасадзім па дрэўцу: вершы / Х.Х. Гурыновіч. – Мінск: Юнацтва, 1993. – 63 с.: іл.

10. Гурыновіч, Х. Птушыная азбука: вершы, загадкі / Х.Гурыновіч; маст. У.А.Малахаў. – Мінск: Юнацтва, 1997. – 31 с.: іл.

11. Гуринович, Ф. Пуще неволи: рассказы, стихи, зарисовки / Федор Гуринович. – Минск: Книгосбор, 2014. – 463 с.

12. Гурыновіч, Ф. Роднасць: паэма / Фёдар Гурыновіч. – Мінск: Кнігазбор, 2015. – 396 с.

13. Гурыновіч, Хв. Сквар. Рэчка: вершы / Хведар Гурыновіч // Краса і сіла: анталогія беларускай паэзіі XX стагоддзя /склад. М. Скобла. Гурыновіч, Хв. Сквар. Рэчка: вершы Мінск: Лімарыус, 2003. – С. 638–639.

14. Гуринович, Ф.Ф. Спасибо солнышку: стихи, рассказы / Фёдор Гуринович. – Минск: Книгосбор, 2010. – 200 с.

15. Гуринович, Ф.Ф. Сто хрустальных родничков: стихи, рассказы для детей дошк. и мл. шк. возраста / Ф.Ф.Гуринович. – Минск: Юнацтва, 2000. – 151 с.: ил.

16. Гуринович, Ф. Соловей / Федор Гуринович // Неман. – 2014. – №6. – С.81–84.

17. Гурыновіч, Хв. Сустрэнемся ля вогнішча: лірыка / Хведар Гурыновіч. – Мінск: Кнігазбор, 2006. – 196 с.

18. Гурыновіч, Хв. Там песні жывыя Айчыны / Хведар Гурыновіч // Сусвет дабрыні: эсэ, артыкулы, дыялогі / Уладзімір Саламаха. – Мінск: Маст. літ., 2005. – С. 189–197.

19. Гурыновіч, Хв. Хлеб і соль: вершы / Хведар Гурыновіч. – Мінск: Маст. літ., 1980. – 96 с. – (Першая кніга паэта).

20. Гурыновіч, Хв. Шматгалосая кветка: вершы / Хведар Гурыновіч. – Мінск: Маст. літ., 1983. – 95 с.

21. Гурыновіч, Хв. Што я ўнуку скажу?: вершы / Хведар Гурыновіч. – Мінск: Маст. літ., 1995. – 127 с.

Аб жыцці і творчасці Хведара Гурыновіча:

1. Артамонова, А. Встреча с поэтом / А. Артамонова // Салігорскі веснік. – 1999. – 30 студзеня.

2. Вярба, В. Права для першай песні / В. Вярба // Беларусь. – 1981. – №3. – С. 28–29. Рэцэнзія на кнігу вершаў Хв. Гурыновіча «Хлеб і соль».

3. Вінаградава, С. Паэзія – гэта стан душы / С. Вінаградава // Калійшчык Салігорска. – 2009. – 20 лютага.

4. Гаўрусева, Т. Разумець сусвет і саміх сябе / Т. Гаўрусева // Мінская праўда. – 1999. – 13 мая.

5. Гуліцкі, А. «Лес на далоні» / А. Гуліцкі // ЛіМ. – 2002. – 4 студзеня.

6. Гурыновіч, Ф. ...А за родную мову ўсё-такі балюча / Фёдар Гурыновіч // Калійшчык Салігорска. – 2011. – 4 лістапада. – С. 4.

7. Гурыновіч Хведар Хведаравіч // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Салігорскага раёна. – Мінск, 2004. – С. 494.

8. Грудзінскі, М. Педагог-наватар / М. Грудзінскі // Слуцкі край. – 1996. – 2 кастрычніка.

9. Долголевец, А. Строки, написанные сердцем / А. Долголевец // Калійшчык Салігорска. – 2009. – 24 красавіка.

10. Дзеусава, Т. Ёсць такое свята / Т.Дзеусава // Калійшчык Салігорска. – 2013. – 3 сакавіка. – С. 2.

11. Дзеусава, Т. Радасная падзея: часопіс «Полымя» змясціў на сваіх старонках чарговую падборку новых вершаў Хв. Гурыновіча / Т. Дзеусава // Калійшчык Салігорска. – 1993. – 1 снежня.

12. Жванец, В. Шлях да паэмы / В. Жванец // Салігорскі веснік. – 1998. – 3 студзеня. Рэцэнзія на паэмы Хв. Гурыновіча «Шлях да волі».

13. Жванец, В. Рассказал поэт / В. Жванец // Шахцер. – 2000. – 19 мая.

14. Зямная соль: рэкамендацыйны бібліяграфічны дапаможнік да 55-годдзя Хв. Гурыновіча / Даведачна-бібліяграфічная служба; склад. Марыніч В.А, Сцяцэнка С.В. – Салігорск, Салігорская РЦБ, 2005. – 12 с. – (Нашы землякі).

15. Іванова, Р. ...Адна Радзіма ў нас / Рыма Іванова // Лидер-пресс . – 2015. – 30 сентября. – С. 5.

16. Квасаварава, А. Што мы скажам унукам? / А. Квасаварава // Шахцер. – 1995. – 7 лістапада.

17. Кідзяеў, Э. Творчы вечар паэта-земляка / Э. Кідзяеў // Лидер-пресс. – 2005. – 29 сентября – 5 октября.

18. Когут, В. Аўтограф на ўспамін / В. Когут // Шахцер. – 2003. – 2 снежня.

19. Когут, В. Вера застаецца: аб кнізе Хв. Гурыновіча «Запрашаю пад дождж» / В. Когут // Шахцер. – 2000. – 20 кастрычніка.

20. Краўчэня, Н. Гармонія жыцця: Хв. Гурыновічу – 55 / Н. Краўчэня // Калійшчык Салігорска. – 2005. – 23 верасня.

21. Краўчэня, Н. На прэм'еры кнігі / Н. Краўчэня // Калійшчык Салігорска. – 1995. – 5 снежня.

22. Крывіч з крывічоў: Хв. Гурыновічу – 50 // ЛіМ. – 2000. – 15 верасня. – С. 8.

23. Лаўрэаты літаратурных прэмій // ЛіМ . – 1999. – 1 студзеня.

24. Макарэвіч, В. Хлеб і соль / В. Макарэвіч // Чырвоная змена. – 1980. – 2 лістапада. Рэцэнзія на кнігу Хв. Гурыновіча «Хлеб і соль».

25. Мартинович, А. Радуга над зимним лесом / Алесь Мартинович // Неман. – 2010. – №1. – С. 211–214.
Рецензия на книгу Ф. Гуриновича «Год – как жизнь, жизнь – как год».

26. Мартыненков, П. Новые книги солигорского поэта / Павел Мартыненков // Лидер-пресс. – 2006. – 8-14 ноября.

27. Мартинович, А. Радуга над зимним лесом / Алесь Мартинович // ЛіМ. – 2002. – 8 лютага. – С. 6–7.

28. Нікіціна, Г. Размова была шчырай / Г. Нікіціна // Шахцер. – 2002. – 30 красавіка. Прэзентацыя новай кнігі Хв. Гурыновіча «Пабыць аднаму».

29. Новая книга Ф. Гуриновича // Салігорскі веснік. – 2002. – 25 кастрычніка. О книге Ф. Гуриновича «Сто хрустальных родничков».

30. Новик, Н. Природа – наш общий дом / Н. Новик // Калійшчык Салігорска. – 2012. – 16 сакавіка. – С. 2.

31. Раманава, В. Што пасля сябе ў жыцці пакіну.../ Вікторыя Раманава // Шахцёр. – 2010. – 9 верасня. – С. 21.

Агляд творчасці Ф.Гурыновіча.
32. Раманоўскі, Ф. Руплівае пяро / Ф. Раманоўскі // Калійшчык Салігорска. – 1992. – 7 лютага.

33. Рапницкая, А. Глоток из ста хрустальных родничков / А. Рапницкая // Салігорскі веснік. – 2000. – 1 лістапада.

34. Романова, В. Мелодия весны Фёдора Гуриновича / Виктория Романова // Шахцёр. – 2013. – 28 сакавіка. – С.16.

35. Саламаха, У. Там песні жывыя Айчыны / У. Саламаха // ЛіМ. – 2003. – 28 лютага.

36. Самусевіч, С. Шанаваць родную мову - значыць, любіць Радзіму / С. Самусевіч // Калійшчык Салігорска. – 2010. – 26 лістапада. – С.2.

37. Гуринович, Ф. Спасибо солнышку / Фёдор Гуринович // Калійшчык Салігорска. – 2011. – 1 ліпеня. – С.9.

38. Ставер, Э. Маці паэта / Эра Ставер // Шахцёр. – 2007. – 11 кастрычніка.

39. Сташко, В. Падарунак дзятве / В.Сташко // Салігорскі веснік. – 1997. – 26 лістапада.

40. Тихоновец, А. Гармония мира в поэзии Федора Гуриновича / Анатолий Тихоновец // Салігорскі веснік. – 2005. – 8 снежня.

41. Трафімчук, М. «...Каб была наперадзе нядзеля» / М. Трафімчук // ЛіМ. – 1980. – 7 лістапада. – С.7.

42. Хведар Гурыновіч // Беларускія пісьменнікі-юбіляры 2010 года: бібліяграфічны паказальнік. 2-е паўгоддзе. – ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна», аддзел бібліятэказнаўства. – Мінск, 2010. – С. 29–32.

43. Хведар Гурыновіч: літаратурныя мясціны Беларусі. Салігорскі раён // Маладосць. – 2012. – №3. – С 122–124.

44. Хведар Гурыновіч: таленты Салігоршчыны // Салігорскі веснік. – 1994. – 9 красавіка.

45. Чаркоўская, В. Паэт... паляўнічы... журналіст / Варвара Чаркоўская // Шахцёр. – 2008. – 30 красавіка.

46. Чарота, І. Перад шматгалоссем жыцця / І.Чарота // Маладосць. – 1984. – №7. – С. 164–167.

47. Шиханцова, Л. Разговор шёл не только о поэзии / Л. Шиханцова // Шахцер. – 2009. – 20 лістапада. – С.2.

Складальнік: Ермаковіч І.М.

Рэдактар: Аліхвер Л.В.